ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР
17
ЛІСТАПАДА
1977 г.

№ 31 (1181)

Цана 2 кап.

ПА БДУ ІНФАРМАЦЫЯ

У святочныя дні Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна наведалі дэлегацыі чатырох універсітэтаў сацыялістычных краін.

З далёкай Кубы прыехала да нас дэлегацыя на чале з рэктарам універсітэта Хуан Вэла Валдэс.

Дэлегацыя Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера (ГДР) прыбыла ў саставе сакратара парткома Тэнігкойта, вучонага сакратара Ліндэлаўба пад кіраўніцтвам рэктара універсітэта прафесара Ф. Болька.

З Польшчы да нас прыехалі прафесар Ягелонскага універсітэта Станіслаў Сурма, прафесар Падража, магістр Блайер.

З Сафійскага універсітэта імя К. Ахрыдскага (Балгарыя) прыбылі прафесар Бажыл Ніколаў і дацэнт Стойчаў.

Яны прыехалі, каб прыняць удзел у рабоце навуковай канферэнцыі «Вялікі Кастрычнік і сучаснасць» і ва ўрачыстасцях, прысвечаных 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Дэлегацыі наведалі музей нашага універсітэта, фотавыстаўкі, прысвечаныя 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. Былі падпісаны планы навуковага і культурнага супрацоўніцтва паміж універсітэтамі на 1978—1980 гады.

За час знаходжання ў беларускай сталіцы госці азнаёміліся з мемарыяльным комплексам «Хатынь», Курганам Славы, Дзяржаўным мастацкім музеем БССР, пабывалі ў філармоніі, цырку.

Л. ГРАБЧЫКАВА,
Д. БЫКАВА.

***

Цікавая і разнастайная работа вядзецца на філалагічным факультэце па ідэйнаму выхаванню моладзі.

Распрацаваны спецыяльны план па маральна-эстэтычнаму выхаванню студэнтаў на 1976—1980 гг. Кантралюе выкананне гэтага плана камісія, якую ўзначальвае выкладчыца І. В. Шаблонская. Дапамагае ёй адказная за ідэйна-эстэтычную работу ў камітэце камсамола студэнтка II курса Лена Каваленка.

Камітэт камсамола, актыў філфака стараюцца зрабіць жыццё студэнтаў рознабаковым і цікавым, імкнуцца, каб кожны камсамолец актыўна ўдзельнічаў у жыцці свайго курса і ўсяго факультэта.

Г. ГРЭЛЬ.

***

На геафаку працягваюцца зорныя паходы, прысвечаныя 60-годдзю Вялікага Кастрычніка.

Атрад студэнтаў I, II і III курсаў пад кіраўніцтвам А. Загарэц, І. Крышчановіч пабываў на месцах партызанскай славы Магілёўскай вобласці. Яркія ўражанні пакінуў паход па азёрах Нарачанскага краю. Група студэнтаў II курса ў саставе 30 чалавек наведала радзіму вялікага беларускага паэта Якуба Коласа.

***

Набліжаецца агляд мастацкай самадзейнасці студэнтаў I курса геафака.

Першакурснікі з захапленнем рыхтуюцца прадставіць на суд гледачоў песні, танцы, вершы, маленькія сцэнкі са студэнцкага жыцця.

В. КОЗЕЛ.

АКТЫЎНЫ ПАМОЧНІК ПАРТЫІ

Напярэдадні 60-годдзя Вялікага Кастрычніка ва універсітэце адбылася XXVII справаздачна-выбарная агульнаўніверсітэцкая камсамольская канферэнцыя. Са справаздачным дакладам на ёй выступіў сакратар камітэта камсамола БДУ А. А. ТОЗІК. Сёння мы друкуем вытрымкі з яго даклада.



За мінулыя пасля папярэдніх справаздач і выбараў гады камсамольская арганізацыя нашага універсітэта дабілася новых істотных вынікаў у сваёй дзейнасці, вырасла колькасна, умацавалася палітычна і арганізацыйна. Наша работа, якая была асветлена рашэннямі XXV з'езда КПСС, была падначалена выкананню стаячых перад савецкай вышэйшай школай задач па падрыхтоўцы спецыялістаў, адпавядаючых патрабаванням сённяшняга і заўтрашняга дня.

Натуральна, што падрыхтаваць такога спецыяліста толькі ў рамках вучэбнага працэсу немагчыма. Гэта можа зрабіць ВНУ ў сукупнасці ўсіх сваіх кампанентаў, у тым ліку і пры актыўным удзеле ў вучэбна-выхаваўчым працэсе камсамольскіх арганізацый.

Асновай усёй ідэйна-выхаваўчай работы з'яўляецца ідэйна-палітычнае выхаванне, глыбокае, станоўчае авалоданне кожным студэнтам марксісцка-ленінскім вучэннем, веданнем заканамернасцей развіцця нашага грамадства, задач, якія стаяць перад нашай краінай на сучасным этапе. Зыходзячы з гэтага камітэт камсамола пастаянна ўдзяляў увагу дасканаленню форм і метадаў сумеснай работы з кафедрамі грамадскіх навук. Адбылося некалькі сумесных пасяджэнняў бюро камітэта камсамола універсітэта, камітэтаў камсамола факультэтаў з кафедрамі грамадскіх навук. Выкладчыкі кафедр прымаюць актыўны ўдзел у пасяджэннях, пленумах камітэта камсамола, камсамольскіх сходах. Значна актывізавалася наша сумесная работа па арганізацыі вывучэння матэрыялаў XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ, XVII з'езда ВЛКСМ, дакументаў, звязаных з падрыхтоўкай і прыняццем новай Канстытуцыі, арганізацыі лекцыйна-прапагандысцкай дзейнасці студэнтаў, навукова-даследчай работы па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, стварэнню розных кансультацыйных пунктаў і г. д.

Асабліва значны вопыт дзелавога супрацоўніцтва накоплен намі ў сумеснай рабоце з кафедрай гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў (загадчык кафедры прафесар У. М. Сікорскі). У сакавіку 1976 г. адбылося сумеснае пасяджэнне бюро камітэта камсамола універсітэта і кафедры, прысвечанае дасканаленню падрыхтоўкі студэнтаў да грамадска-палітычнай практыкі ў ходзе вывучэння грамадскіх навук. Былі вызначаны шляхі ўдасканалення гэтай работы, акрэслены абавязкі камсамольскай арганізацыі і кафедры ў рабоце са студэнтамі ў пазавучэбны час, распрацаваны меры па паляпшэнню арганізацыі лекцыйна-прапагандысцкай дзейнасці студэнтаў, больш шырокаму разгортванню студэнцкіх навуковых даследаванняў, звязаных з вывучэннем вопыту работы партыйных і камсамольскіх арагнізацый горада і рэспублікі, напісаннем гісторый буйных камсамольскіх арганізацый. Мы лічым, што такія мерапрыемствы аказалі пэўны ўплыў на паляпшэнне паспяховасці студэнтаў па грамадскіх навуках (абсалютная паспяховасць за два гады павысілася на 1 працэнт, якасная—на 3,6).

За мінулыя два гады некалькі палепшылася паспяховасць студэнтаў наогул (з 92,6 працэнта да 93,7 працэнта). Побач з традыцыйнымі формамі работы гэтаму садзейнічала і разгарнуўшаяся ў камсамольскай арганізацыі універсітэта ў ходзе вывучэння матэрыялаў XXV з'езда КПСС спаборніцтва паміж камсамольскімі арганізацыямі акадэмічных груп пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!».

У нас склаліся добрыя формы работы з першакурснікамі. Гэта школы першакурснікаў, калектыўнае і індывідуальнае кураторства студэнтаў-першакурснікаў, арганізацыя дадатковых кансультацый і пробных заняткаў і г. д. Але гэтага недастаткова. У маі 1977 г. сацыялагічная лабараторыя пры камітэце камсамола (навуковы кіраўнік І. Я. Пісарэнка) правяла сацыялагічныя даследаванні сярод студэнтаў усіх факультэтаў. На пытанне «Якія цяжкасці ў вучобе аказаліся для Вас асабліва непрадугледжанымі», 30 працэнтаў апытаных студэнтаў фізічнага факультэта адказалі: «Самастойнае, без знешняга кантролю размеркаванне часу», 15 працэнтаў — «Адсутнасць уменння самастойна працаваць над кнігай», 12 працэнтаў — «Няўменне канспектаваць лекцыі» і г. д.

Як бачыце, наша дапамога першакурсніку вельмі і вельмі патрэбна. Паспяховасць першакурснікаў па выніках апошняй сесіі — 90.5 працэнта (на 3 працэнты ніжэй агульнаўніверсітэцкай). Але, як ні дзіўна, самая нізкая паспяховасць не на першым, а на 2-м курсе—89,5 працэнта. Відаць, студэнты, здаўшы першыя сесіі, расслабляюцца, і паспяховасць, замест таго, каб расці, зніжаецца. Камсамольскім арганізацыям трэба звярнуць увагу на гэтыя абставіны.

Важным сродкам падрыхтоўкі спецыялістаў з'яўляецца навукова-даследчая работа студэнтаў. З мэтай умацавання ўплыву камсамольскіх арганізацый на фарміраванне тэматыкі навуковых даследаванняў, павышэнне эфектыўнасці студэнцкіх даследаванняў камітэт камсамола стварыў агульнаўніверсітэцкі студэнцкі навуковы савет, закліканы разам з адміністратыўным органам — саветам па НДРС здзяйсняць кіраўніцтва студэнцкай навуковай дзейнасцю ва універсітэце. І хаця савет робіць толькі першыя крокі, аб некаторых выніках ужо можна гаварыць: палепшылася падрыхтоўка студэнцкіх навуковых канферэнцый, павялічылася колькасць прыкладных навуковых даследаванняў (асабліва на гістарычным факультэце), саветам былі падрыхтаваны і праведзены дзве навукова-практычныя студэнцкія канферэнцыі. Сёння ў нас навукова-даследчай работай займаецца 7239 студэнтаў, з іх 949 заняты распрацоўкай гасдагаворных тэм.

Выпускнік ВНУ сёння гэта не проста чалавек, які добра ведае сваю справу, але і ўмелы арганізатар, выхавацель. Неацэнную дапамогу ў падрыхтоўцы такіх спецыялістаў аказвае грамадска-палітычная практыка студэнтаў. Па-ранейшаму яе ўдасканальванню, пошуку новых форм і метадаў работы разам з партыйнай арганізацыяй, рэктаратам вялікую ўвагу ўдзяляе і камітэт камсамола: сумесна з сацыялагічнай лабараторыяй распрацаваны сістэмы ГПП, палажэнне аб грамадска-палітычнай практыцы, праведзена некалькі семінараў камсамольскага актыву, сустрэча з кураторамі, вызначаны суадносіны ГПП з Ленінскім залікам, функцыі адміністрацыі і камсамольскай арганізацыі, а таксама тэрміны атэстацыі. У саставе камітэта камсамола створан сектар Ленінскага заліку і ГПП.

Важнае месца ў сістэме камуністычнага выхавання студэнцтва адыгрывае працоўнае выхаванне. Падкрэсліваючы ролю студэнцкіх будаўнічых атрадаў, П. М. Машэраў гаварыў на XXVIII з'ездзе КПБ, што значныя плады гэтага руху бачацца не толькі ў асвоеных капітальных укладаннях і пабудаваных аб'ектах, што каштоўна і патрэбна нашаму народу, але не ў меншай меры і ў яго ідэйна-маральных матывах і выніках. Бо студэнцкі будаўнічы атрад моцна звязаў працу тысяч юнакоў і дзяўчат з працай рэспублікі і ўсёй краіны.

Штогод 2 тысячы студэнтаў праходзяць працоўную і маральную загартоўку ў СБА універсітэта. Вы памятаеце, што па выніках IX пяцігодкі універсітэт быў узнагароджан Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, а камсамольская арганізацыя па выніках 1975 года—Ганаровай граматай мінскіх АК КПБ і аблвыканкома. Па выніках працоўнага лета 1977 года універсітэт выйшаў пераможцай сацспаборніцтва сярод ВНУ горада Мінска і ўзнагароджан пераходным Чырвоным сцягам АК КПБ і аблвыканкома. Ва універсітэце лепшымі аказаліся атрады юрыдычнага факультэта.

Улічваючы, што праз СБА ў нас могуць прайсці толькі 20 працэнтаў студэнтаў, і разумеючы вялікае значэнне працоўнага выхавання, мы, выкарыстоўваючы багаты вопыт студэнцкага будаўнічага руху, вось ужо два гады ўсіх студэнтаў, якія выязджаюць на сельгаспрацы, з дапамогай рэктарата і дэканатаў таксама зводзім у студэнцкія атрады. Кожны атрад атрымлівае адпаведную атрадную дакументацыю, паміж атрадамі разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва. Вопыт двух гадоў паказаў, што такая практыка апраўдала сябе цалкам.

Камітэт камсамола, адзначаючы важнасць інтэрнацыянальнага выхавання, стварыў у саставе камітэта камсамола аддзел, а ў камітэтах камсамола факультэтаў — сектары інтэрнацыянальнага выхавання. Ва універсітэце і на многіх факультэтах паспяхова працуюць клубы інтэрнацыянальнай дружбы, праводзяцца вечары, падтрымліваецца сувязь з саветам дружбы універсітэта і з лідэрамі зямляцтваў замежных студэнтаў, якія навучаюцца ва універсітэце.

Кіруючыся ўказаннямі XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ, камітэт камсамола універсітэта ў справаздачны перыяд шмат зрабіў па маральнаму і эстэтычнаму выхаванню студэнтаў. Улічваючы, што гэтыя пытанні зусім нядаўна глыбока і падрабязна разглядаліся на пленуме камітэта камсамола, падрыхтаваным з дапамогай кафедры марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, тут неабходна толькі падкрэсліць, што гэты напрамак работы патрабуе пастаяннай увагі камітэта камсамола.

У камсамольскай арганізацыі універсітэта 75 цэхавых арганізацый супрацоўнікаў. Сёння з задавальненнем можна сказаць, што за справаздачны перыяд у гэтых арганізацыях значна палепшылася ўнутрысаюзная работа, павысілася грамадска-палітычная актыўнасць камсамольцаў-выкладчыкаў, аспірантаў, супрацоўнікаў. Асабліва прыемна тое, што ў радзе правафланговых ідуць нашы найбольш буйныя камсамольскія арганізацыі: НДІ прыкладных фізічных праблем і вылічальнага цэнтра (сакратары Юрый Новікаў і Анатоль Грышановіч).

У справаздачны перыяд ва універсітэце быў, практычна, адноўлены савет маладых вучоных. Саветы былі створаны таксама на многіх факультэтах і ў падраздзяленнях універсітэта. Савет маладых вучоных БДУ (старшыня савета—кандыдат хімічных навук Т. М. Пушкарова) робіць многае па арганізацыі конкурсаў работ маладых вучоных, філасофска-метадалагічных семінараў і г. д. Па выніках спаборніцтва ў 1976 годзе наш савет заняў першае месца ў г. Мінску.

Вось ужо два гады паміж камсамольскімі арганізацыямі факультэтаў вядзецца сацыялістычнае спаборніцтва са штогадовым падвядзеннем вынікаў па 12 асноўных напрамках работы. Нядаўна бюро камітэта камсамола падвяло вынікі сацспаборніцтва за навучальны год. Пераможцамі выйшлі камсамольскія арганізацыі **гістфака, філфака і факультэта прыкладной матэматыкі** (сакратары В. Левашэвіч, Т. Абрамчык, В. Гарус).

Зыходзячы са сказанага, новаму саставу камітэта камсамола ў сваёй рабоце неабходна звярнуць увагу на наступныя пытанні: палепшыць работу камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп, іх ролю ў ідэйна-выхаваўчай рабоце, у барацьбе за павышэнне паспяховасці; узмацніць увагу да арганізацыі сацспаборніцтва; камітэту камсамола універсітэта па многіх напрамках работы трэба перайсці на ўзровень метадычнага кіраўніцтва дзейнасцю факультэцкіх арганізацый. Неабходна самую вялікую ўвагу звярнуць на паляпшэнне ідэйна-выхаваўчай работы ў студэнцкіх інтэрнатах, палепшыць арганізацыю адпачынку студэнтаў.

У дакладзе былі асветлены дапёка не ўсе нашы праблемы. У заключэнне дазвольце выразіць упэўненасць, што камсамольская арганізацыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, пастаянна ўдасканальваючы свае формы і метады работы, і надалей будзе актыўным памочнікам партыйнай арганізацыі, прафесарска-выкладчыцкага саставу ў выкананні задач, пастаўленых партыяй перад вышэйшай школай.

У СЯМ'І СТУДЭНТАЎ

Сёлета БДУ адзначыў 15-годдзе з пачатку падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй для замежных краін. За гэты час універсігэт выпусціў каля 400 кваліфікаваных спецыялістаў — замежных грамадзян. Ён устанавіў цесныя сувязі з 6 буйнейшымі універсітэтамі краін сацыялістычнай садружнасці: Іенскім універсітэтам імя Шылера (ГДР), Сафійскім універсітэтам імя Ахрыдскага (НРБ), Ягелонскім універсітэтам (СФРЮ), Гальскім універсітэтам імя Марціна Лютэра (ГДР) і Камагуэйскім універсітэтам (Куба). Штогод каля 200 выкладчыкаў і студэнтаў БДУ выязджаюць за межы СССР для чытання ў ВНУ лекцый, на стажыроўку, азнаямленчую вытворчую практыку і г. д.

З кожным днём мацнеюць сувязі паміж савецкімі і замежнымі студэнтамі, якія навучаюцца ў БДУ. Яны ўжо распачалі падрыхтоўку да XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване.

Зараз ва універсітэце вучацца 544 студэнты, стажоры і аспіранты з 59 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Паўднёвай Амерыкі. Шмат прадстаўнікоў развіваючыхся краін — Рэспублікі Чад і Экватарыяльнай Гвінеі,



Малагасійскай Рэспублікі і Шры Ланка і многіх іншых.

Большасць замежных студэнтаў займаецца на «добра» і «выдатна», вядзе грамадскую работу. Напрыклад, ва Усесаюзным конкурсе па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху прыняў удзел кожны чацвёрты замежны студэнт.

Няма сумнення, што дружба, таварыскасць і ўзаемадапамога савецкіх і замежных студэнтаў будуць умацоўвацца і ў далейшым.

В. ДРАЧОЎ.

Фота аўтара.

НА ЗДЫМКАХ: «Няхай жыве дружба!»; мангольскія студэнты ў кабінеце гісторыі КПСС; у лабараторыі фізфака.

СВЯТА ФЕСТЫВАЛЮ

Савецкі Саюз развівае і ўмацоўвае дружбу і супрацоўніцтва з усімі краінамі свету. І таму не дзіўна, што ў БДУ вучацца студэнты трох кантынентаў нашай планеты.

Напярэдадні знамянальнай падзеі—60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі—у нашай установе прайшоў фестываль нацыянальнай самадзейнасці замежных студэнтаў.

Аб векапомных днях 1917 года расказаў сабраўшымся камуніст Чыгрын.

Студэнты з Гвінеі адкрылі фестываль песняй аб адзінстве ўсіх краін Афрыкі. Аб дружбе многіх народаў гэтага кантынента і Савецкага Саюза спявае аб'яднаны ансамбль студэнтаў з Бурундзі і Тога.

Бурнымі апладысментамі віталі прысутныя групу студэнтаў з Лівана. Нацыянальны танец, бадзёры і жыццярадасны, вельмі спадабаўся ўсім.

Свой падарунак падрыхтавалі студэнты з В'етнама. Яны выканалі песню пра Хо Шы Міна.

Самы актыўны ўдзельнік фестывалю—ансамбль студэнтаў з Конга—выканаў некалькі нацыянальных песень. Спадабаўся гледачам і танец ансамбля, які «расказаў» пра паўстанне прыгнечаных рабоў, іх перамогу.

У заключэнне прагучала «Вансерэмас» («Мы пераможам»), песня, якую выканаў інтэрнацыянальны ансамбль студэнтаў з С'ера-Леоне, Ліберыі, Нігерыі, Танзаніі і Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі.

Фестываль нацыянальнай самадзейнай творчасці стаў яркім сведчаннем росту салідарнасці студэнтаў розных краін.

І. ЕМЕЛЬЯНОВІЧ.

(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).

17 лістапада — Міжнародны дзень студэнтаў



На факультэце радыёфізікі

Першыя вынікі

Камсамольская арганізацыя факультэта радыёфізікі маладая: ёй адзін год. Тым не менш імкненне стаць баявым, актыўным атрадам камсамолііі універсітэта ўжо дало першыя вынікі.

Вялікую ролю ў фарміраванні актыўнай жыццёвай пазіцыі студэнта іграе грамадска-палітычная практыка. Кожны камсамолец факультэта радыёфізікі мае асабісты комплексны план, які ўключае пытанні па асноўных напрамках вучэбнай, грамадскай і навуковай работы. Камітэт камсамола кантралюе ход выканання планаў.

Шырока разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!» Па выніках мінулага навучальнага года лепшай прызнана камсамольская арганізацыя II курса; з пярвічных арганізацый — 5-я група IV (цяпер V) курса (староста М. Пракапеня, камсорг В. Варшчэнка).

Пераможцамі сацспаборніцтва паміж камсамольцамі за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка сталі А. Зайноўскі, А. Паборцаў, В. Пазняк, А. Усталаў, А. Петухоў, В. Моськін, В. Чарнушэвіч і многія іншыя.

Намаганнямі мастацкага савета на факультэце створаны мужчынскі хор, школа бальнага танца, гурток народнага танца.

Практыка—за мяжой

У гэтым годзе група студэнтаў факультэта праходзіла вытворча-азнаямленчую практыку ў ГДР.

Кіраўнік групы — дацэнт кафедры радыёфізікі і электронікі С. Мулярчык — і 8 пяцікурснікаў правялі ў брацкай сацыялістычнай краіне 21 дзень. Яны пазнаёміліся з цыклам лабараторных работ па курсу агульнай фізікі, радыёфізікі і квантавай электронікі. Агледзелі сучаснае абсталяванне лабараторый, наведалі астрафізічную абсерваторыю АН ГДР. У абсерваторыі студэнтаў зацікавіў тэлескоп — адзін з самых вялікіх тэлескопаў Еўропы з дыяметрам люстры 2 метры.

Радыёфізікам спадабаліся экскурсійныя паездкі па гарадах ГДР — старажытным Эйзенаху, вядомым сваім аўтамабільным заводам, прыгожым Лейпцыгу, горадзе-пабраціме Патсдаме.

Другая група студэнтаў праходзіла практыку ў Балгарыі на кафедры радыёфізікі фізічнага факультэта Сафійскага універсітэта імя К. Ахрыдскага.

За час практыкі савецкія юнакі і дзяўчаты пазнаёміліся з навуковымі работамі балгарскіх студэнтаў і навуковых супрацоўнікаў.

Створана лабараторыя

На кафедры ЭММ паявілася студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя; у ёй працуюць студэнты ўсіх курсаў. Праведзен семінар з удзелам малодшакурснікаў. Юнакі і дзяўчаты самастойна працуюць у лабараторыі над актуальнымі праблемамі сучаснай навукі. У бліжэйшы час на кафедры мяркуецца арганізаваць гурток па пытаннях праграміравання. Членамі гуртка ў перспектыве будзе праведзена прадметная алімпіяда сярод студэнтаў II—IV курсаў.

У інтэрнаце

Інтэрнат № 8 быў заселен у 1974 годзе. Тут прыгожыя хол і вестыбюль, афармілі якія самі студэнты, светлыя, сонечныя пакоі.

Студэнты-радыёфізікі праводзяць частковы рамонт пакояў, работы па азеляненню прылягаючай да дома тэрыторыі. На рахунку студсавета інтэрната шмат добрых спраў. Але для падтрымання дысцыпліны, арганізацыі актыўнага адпачынку студэнтаў зроблена далёка не ўсё. Гэта трэба прыняць да ведама санкамісіі і студсавету інтэрната.

А. МАРЧУК.

(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).

СЛОВА ПЕРАМОЖЦАМ

1 красавіка 1976 года ў газеце «Беларускі універсітэт» была апублікавана пастанова бюро камітэта камсамола універсітэта «Аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!» у камсамольскай арганізацыі універсітэта». Пераможцамі спаборніцтва была прызнана група палітэканомаў II курса гістарычнага факультэта. У другакурснікаў стопрацэнтная паспяховасць за мінулы навучальны год.

Аб жыцці групы расказвае яе камсорг Наталля Сінічэнка.

— Асабліва нялёгка было спачатку, бо ў саставе групы людзі розных характараў і ўзростаў. Але адно аб'яднала студэнтаў — прага да паглыблення ведаў, імкненне зрабіць сваё жыццё поўным і змястоўным. Як і ўсе камсамольцы нашага універсітэта, мы таксама вырашылі ўключыцца ў спаборніцтва «Ніводнага адстаючага побач!» Галоўнай нашай мэтай стала задача павышэння якасці вучобы. У групе 26 студэнтаў. З іх восем выдатнікаў, а пяць камсамольцаў здалі дзве сесіі толькі на «выдатна». Гэта В. Кулажанка, С. Гнацюк, А. Муталімава, В. Пляскач, І. Цярэнцьеў. 17 студэнтаў займаюцца на «добра» і «выдатна», 6 чалавек маюць толькі па адной чацвёрцы — гэта наш рэзерв папаўнення атрада выдатнікаў. І вось толькі адна тройка не дазваляе нам сказаць, што мы займаемся на «4» і «5».

Даволі цікава праходзяць семінары. Адчуваецца агеньчык, жывая думка, добрасумленная дамашняя падрыхтоўка, высокая актыўнасць. Вельмі часта разгараюцца спрэчкі, узнікаюць дыскусіі. Добрай паспяховасці значна садзейнічае ўдзел студэнтаў у навуковых гуртках.

Група з'яўляецца дружным баявым калектывам, у якім устанавілася атмасфера ўзаемадапамогі, таварыскай непрымірымасці да фармалізму «Нават у чыталку ходзім разам», — адзначае Наташа.

Усе камсамольцы паспяхова прайшлі грамадска-палітычную атэстацыю. Значнае месца ў жыцці групы займаюць пытанні працоўнага выхавання. Нашы камсамольцы працавалі ў Казані і ў Малдавіі, на Пскоўшчыне і ў нашай роднай Беларусі. Колькі цікавых успамінаў, уражанняў прывезлі з сабой рабяты! Было чым падзяліцца і зацікавіць. І, я думаю, тыя, хто не быў яшчэ ў будатрадзе, абавязкова пастараюцца пабыць.

Многа цікавых спраў робіцца ў нашай групе, але галоўнае— мы заўсёды будзем імкнуцца да таго, каб кожны камсамолец пастаянна паглыбляў свае веды, навыкі даследчыка, расшыраў палітычны кругагляд, прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці...

Размаўляючы з Наташай Сінічэнка, мы заўважылі, што ёсць у гэтай дзяўчыны такая «жывінка», якая будзіць камсамольцаў на добрыя справы. Гэта пацвердзілі і яе сябры.

Вольга Кулажанка:

— Вельмі добры чалавек наша Наташа. Да яе можна звярнуцца з любой просьбай, любым пытаннем. Наташа заўсёды дасць разумную і канкрэтную параду. Чужую бяду прымае, як сваю. Сціплая. Сардэчная. Яе хвалююць усе справы. Адным словам, цаны ёй няма!

Сакратар камітэта камсамола гістарычнага факультэта Валерый Левашэвіч:

— Любяць і паважаюць Наташу ў калектыве. Любое даручэнне выконвае сур'ёзна, з адказнасцю. Не выпадкова, што група заняла першае месца ў спаборніцтве «Ніводнага адстаючага побач!» Жыццё камсамольцаў у многім залежыць ад актывістаў.

Год 60-годдзя Вялікага Кастрычніка, год прыняцця новай Канстытуцыі СССР патрабуе ад нас, студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна, высокай адказнасці за выкананне задач, якія стаяць перад намі, — авалодання ведамі, станаўлення кожнага студэнта як высокакваліфікаванага, ідэйна падрыхтаванага спецыяліста.

Хочацца верыць, што рабяты II курса гістарычнага факультэта аддзялення палітэканоміі з гонарам апраўдаюць сваё званне пераможцаў.

А. ЯКУБОЎСКАЯ,
Л. ЯЦЭВІЧ.
(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).

РАМОНАК

КЛУБ АМАТАРАЎ ПРЫРОДЫ

Вада — гэта і рэкі, і моры, і ручаі. Гэта кроплі дажджу. Мы любуемся прывабнымі струменямі фантанаў, п'ём газіроўку з аўтамата, лёгка перасковваем цераз лужыны на асфальце і менш за ўсё думаем аб тым, што недзе там, пад тратуарам, у трубах каналізацыі таксама шуміць вада — брудная, мутная, агіднай, але таксама вада. А колькі вады спажываюць нашы прадпрыемствы? Вада працуе: мые, ачышчае, растварае і адначасова ўвабірае ў сябе вялізную колькасць розных рэчываў, губляючы свае першапачатковыя ўласцівасці. І вось такая забруджаная вада, здаецца, зноў вяртаецца назад у прыроду і нясе з сабою шмат бед.

Раіса Несцяровіч, член СНДЛ, атрымала на ўсесаюзным конкурсе грамату Усесаюзнага хімічнага таварыства імя Д. І. Мендзялеева за работу па ачыстцы сцёкавых вод ВА «Палімір» ад уланідаў.

Сюды ў лабараторыю прыходзяць студэнты розных курсаў. Вось з нейкім зачараваннем рыхтуюць свае першыя вопыты першакурснікі. Сярод іх ёсць і студэнт біялагічнага факультэта Сяргей Шэлег, якога прыцягнулі сваёй актуальнасцю справы, што вырашаюцца СНДЛ хімікаў.

Студэнтам другога-трэцяга курсаў у лабараторыі ўсё прывычна і знаёма, а старшакурснікі ўвогуле трымаюцца ўпэўнена — яны тут ветэраны.

ЛЕКАРЫ ВАДЫ

Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў па ахове прыроды прымае шэраг мер, каб не дапусціць скідвання сцёкавай вады ў прыродныя вадаёмы.

Над пытаннямі абеззаражвання сцёкавых вод, над праблемамі паўторнага выкарыстання адпрацаванай вады думаюць вучоныя.

Лабараторыі кафедры радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі нашага універсітэта, мне здаецца, нагадваюць нечым рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы. Нагадваюць не толькі белізною сцен, белымі халатамі супрацоўнікаў, перапляценнем гумавых трубачак і шлангаў, зіхаценнем шкляных прабірак — нагадваюць па сутнасці. Тут таксама лечаць, вяртаюць да жыцця... ваду. Займаюцца гэтым супрацоўнікі СНДЛ — студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі па ахове навакольнага асяроддзя, якая створана на правах структурнага падраздзялення хімфака ў 1974 годзе, — юнакі і дзяўчаты з розных курсаў; імі кіруе старшы навуковы супрацоўнік, кандыдат хімічных навук Ала Міхайлаўна Кавалеўская. Да кіраўніцтва асобнымі работамі прыцягваюцца найбольш вопытныя супрацоўнікі: загадчык кафедры Я. П. Пятраеў, дацэнт Б. Р. Шлык, кандыдат хімічных навук М. Г. Ніконенка і іншыя.

А вось і сама «пацыентка», ці, дакладней кажучы, працоўны матэрыял — вада. Яна пералiваецца па трубачках, булькае, адстойваецца ў прабірках. Мутная, белая, чырванаватая ад іржы. Але ёй не да твару гэтая рознакаляровасць. Вада павінна быць чыстай і празрыстай — як сляза, як шкло, як крышталь — мы так прывыклі яе ўспрымаць.

— Нашы студэнты зараз удзельнічаюць у распрацоўцы некалькіх тэм, — расказвае аб рабоце СНДЛ А. М. Кавалеўская, — дзве з якіх уваходзяць у народнагаспадарчы план БССР. Гэта — «Ачыстка сцёкавых вод ВА «Палімір» (Наваполацк)» і «Ачыстка дыстылятаў гарадскіх сцёкавых вод з мэтай атрымання вады для водазабеспячэння».

Акрамя таго, студэнты пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў кафедры ўдзельнічаюць у распрацоўцы некалькіх гасдагаворных тэм па заяўках хімічных прадпрыемстваў розных гарадоў краіны. З дакладамі аб сваіх распрацоўках члены СНДЛ рэгулярна выступаюць на канферэнцыях маладых вучоных-хімікаў, прымаюць удзел у рэспубліканскіх і ўсесаюзных аглядах-конкурсах студэнцкіх навукова-даследчых работ. У мінулым навучальным годзе выпускніца факультэта

— Што мне дала работа ў СНДЛ? — паўтарыў маё пытанне пяцікурснік Аляксандр Кірэеў. — У першую чаргу — навык самастойнай навуковай працы. Ну і, акрамя таго, — прыемна займацца сапраўднай, жывой справай, мець магчымасць звязаць свае распрацоўкі з патрэбамі вытворчасці.

Саша Кірэеў яшчэ на III курсе прыйшоў у СНДЛ. Некалькі цікавых курсавых работ падрыхтаваў ён тут, а зараз, па тэматыцы СНДЛ будзе пісаць дыпломную работу.

Для пяцікурсніцы Раісы Слуцкай тэма яе будучай дыпломнай таксама не новая. Другі год працуе яна над праблемай ачысткі сцёкавых вод чацвёртага цэха ВА «Аргшкло», што ў г. Дзяржынску Горкаўскай вобласці. На яе стале — невялічкая каністра з мутнай белаватай вадкасцю.

— Гэтая вада ў нас на вагу золата, — смяецца Рая.

І сапраўды. За гэтай забруджанай вадой супрацоўнікі кафедры спецыяльна ездзяць у Дзяржынск на прадпрыемства. У вадзе гэтай растворан манамер мецілкрылат, які нельга аддзяліць ад вады простымі фізічнымі метадамі. Вось і «чаруе» Раіса Слуцкая над сваёй «каштоўнай» вадой, дабаўляючы ў яе ў розных колькасцях манамер. Потым гэтыя пробы абпраменьваюцца іянізуючым выпраменьваннем. У залежнасці ад часу выпраменьвання атрымліваюцца розныя эфекты — манамер палімерызуецца, выпадае ў ападак, які ўжо можна проста адфільтраваць.

— І вось вынік! — Раіса трымае ў руках прабірку з празрыстай вадой. Вада гэта хімічна яшчэ не зусім чыстая, але яе можна выкарыстоўваць зноў у замкнутых цыклах вытворчасці, што само па сабе дае вялікую эканомію і вады і грашовых сродкаў.

— Метады ачысткі сцёкавых вод, якія выкарыстоўваюцца ў нашай прамысловасці, не заўсёды дасканалыя і дорагакаштуючыя, — расказвае непасрэдны кіраўнік работы Раісы Слуцкай Ала Васільеўна Давідоўская. — У параўнанні з імі наш метад радыяцыйна-хімічнай ачысткі больш якасны і, галоўнае, больш танны. Мы ўпэўнены, што іменна за нашым метадам будучыня.

Праходжу па цокальнаму паверху хімічнага факультэта. Хтосьці нечакана прыадчыніў дзверы, на якіх стаіць характэрны значок радыяцыі. Дзяўчаты ў белых халатах апускаюць прабіркі з пробамі вады ўнутр гамаўстаноўкі. Даследаванні спосабаў радыяцыйна-хімічнай ачысткі вады працягваюцца.

Т. САХАШЧЫК.

МЫ ТВАЕ ВУЧНІ, ПРЫРОДА

Бадай што ў адносінах практыкі больш за ўсё пашанцавала нам, біёлагам. Пачынаючы з першага курса, мы праходзім вучэбна-палявую практыку на ўлонні прыроды. Слова «практыка» выклікае ў нас успаміны аб самых светлых днях студэнцкага жыцця. Магчыма, таму, што на працягу шасці тыдняў увесь курс жыве аднымі інтарэсамі, адной сям'ёй.

Сёлета мы праходзілі практыку ў в. Караліна Стаўбцоўскага раёна. Нельга не сказаць аб тым, якія гэта прыгожыя мясціны. Прырода шчодра адарыла харастом гэты куток. Тут працякае адна з самых прыгожых рэк Беларусі, аб якой складзена мноства песень і вершаў, якую пачціва называюць «бацька-Нёман». Аб гэтых мясцінах з любоўю ўспамінаў Якуб Колас у сваёй паэме «Новая зямля» — тут прайшлі яго дзяцінства і юнацтва.

Аднак сваёй маляўнічасцю гэты куток прыцягвае не толькі аматараў прыроды. Сюды прыязджае адпачыць мноства турыстаў. І далёка не ўсе яны беражліва адносяцца да прыроды. Таму ўплыў так называемага антрапагеннага фактару на прыроду краю ўсё больш узрастае. Варварскія адносіны да навакольля значна збядняюць гэтыя месцы. Смецце, незагашаныя кастры, зломаныя дрэвы, разбураныя гнёзды, вытаптаная трава — вось што застаецца пасля гора-турыстаў. Чаму людзі не ўмеюць любіць прыроду? Гэтае пытанне паўставала перад намі амаль кожны дзень у перыяд праходжання практыкі.

Чым жа займаліся мы? Мы вучыліся лепш ведаць і разумець прыроду. Вучоба давалася не так лёгка. У час першых заалагічных экскурсій мы прайшлі некаторую колькасць кіламетраў і атрымалі такое мноства інфармацыі, што нават разгубіліся: уся разнастайнасць птушак, з якімі знаёміліся, стала раптам аднолькава шэрабура-малінавай з жоўта-зялёным адценнем, а іх спевы — здзіўляюча аднастайнымі. Але прайшоў час, і нашы вочы ўбачылі ўсю разнастайнасць фауны. У многім гэтаму дапамаглі індывідуальныя заданні, якія мы выконвалі з мэтай больш глыбокага азнаямлення з той ці іншай групай жывёл.

Шмат новага далі нам экскурсіі па геабатаніцы: мы вывучылі заканамернасці размеркавання раслін іменна ў жывой прыродзе. Сабралі гербарыи, даведаліся аб многім новым у нашай флоры.

І ўсё ж такі лета — гэта лета. Мы стараліся актыўна адпачываць: кіно, спартыўныя спаборніцтвы, танцавальныя вечары. Надвор'е, праўда, не вельмі спрыяла нам, але мы не сумавалі...

Асабліва запомніліся нам паходы па коласаўскіх месцах: Альбуць, Мікалаеўшчына. Яркія ўспаміны пакінула сустрэча з братам Я. Коласа Іосіфам Міхайлавічам у музеі Якуба Коласа ў Мікалаеўшчыне.

Л. КНІГА,
студэнтка III курса
біяфака.

СТРЭЛ — ЗДЫМАК



Ты трымаеш у руках фотаружжо і марыш адлюстраваць, спыніць на здымках усё навакольле. Вось ты праверыў свае здольнасці і магчымасці на знаёмых, сваяках і збіраешся на фотапаляванне.

Але тут абавязкова спыніся і запытайся ў сябе: ці ўпэўнен я, што змагу фатаграфаваць жывёл і птушак, не прыносячы ім шкоды? Таму што калі фатограф не ведае элементарных правілаў фотапалявання, а таксама калі ён не знаёмы з павадкамі і звычкамі птушак — за кожны здымак такога «любіцеля» прырода разлічваецца пакінутымі і разбуранымі птушынымі гнёздамі, напалоханымі птушкамі, загінуўшымі птушанятамі. Каб так не атрымлівалася — неабходна вывучыць паводзіны і біялогію здымаемых жывёл, ведаць правілы фотапаляванння.

Для нас, студэнтаў-заолагаў, фотапаляванне — не толькі эстэтычная асалода, але і новы метад вывучэння розных аспектаў біялогіі птушак.

Да кожнай з іх пры здымцы патрэбен свой падыход. Бывае, недастаткова толькі пазнаёміцца з біялогіяй здымаемага віду, бо нярэдка прыходзіцца сутыкацца з яркімі індывідуальнасцямі сярод птушак. Адны з іх не заўважаюць палатку ля гнязда, у якой хаваецца фатограф, другія не могуць змірыцца з такім суседствам і не падлятаюць да свайго гнязда з птушанятамі. Часам прыходзіцца адмовіцца ад здымкаў, каб не прынесці шкоды птушынаму патомству, якое просіць есці.

Знаёмства з busламі, напрыклад, працягвалася даволі доўга, і ўзнагародай за цярпенне былі абсалютна сяброўскія адносіны гэтай прыгожай птушкі да фатографа. Бусел нават прадэманстраваў, якім чынам ён ахоўвае сваіх дзяцей ад спякоты.

Шэрая слаўка пры паяўленні каля гнязда фатографа поўнасцю ігнаравала яго прысутнасць, занята была яна клопатамі аб сваім пражорлівым патомстве, зрэдку толькі паглядала ў вочка аб'ектыва.



Многа хвалюючых хвілін прыносіць паляванне з фотаапаратам. Аднак неабходна памятаць, што галоўны прынцып фотапалявання — гэта спакой нашых пярнатых сяброў.

А. КАЗУЛІН,
Б. ЯМІНСКІ,
студэнты V курса
біяфака.

Лісток ДАІ

Ваша дзіця пайшло ў школу

Не так даўно пачаўся новы навучальны год. Новыя радасці і клопаты ў рабят і іх бацькоў. Радуюць першыя адзнакі... А як справы з азбукай дарожнага руху? Рабяты, вярнуўшыся з дач, піянерскіх лагераў, адвыклі ад гарадскога шуму, інтэнсіўнага руху.

29 жніўня вучань 60-й сярэдняй школы г. Мінска Алег Хомчанка перабягаў вуліцу Розы Люксембург на чырвонае святло сфетафора і быў збіт аўтамашынай МАЗ-503. Ён дастаўлен у бальніцу. Перад блізка ідучым транспартам перабягаў вуліцу Металістаў Саша Карповіч. І вось вынік неасцярожнасці: у цяжкім становішчы дзіця дастаўлена ў клініку.

За некалькі месяцаў гэтага года ў транспартныя аварыі трапіла больш 50 дзяцей, 5 з якіх загінула. Статыстыка дарожных здарэнняў паказвае, што штогод дзіцячы транспартны траўматызм узрастае ў апошнія дні жніўня і ў пачатку навучальнага года.

У нашым горадзе аддаецца нямала ўвагі юным пешаходам: ледзь узніклі карпусы новых школ, як адразу «выраслі» дарожныя знакі — асцярожна, дзеці! Заблішчэлі белізной пешаходныя пераходы — «зебры». А там, дзе дарога ідзе пад ухіл, паявіліся знакі, абмяжоўваючыя хуткасць руху, агарожы. Але ніякія агарожы і знакі не гарантуюць поўнай бяспекі школьніка, калі сам ён не будзе выконваць правілы руху. Выхаваць дысцыпліну, пераканаць дзіця свядома выконваць патрабаванні законаў вуліц і дарог — абавязак кожнай сям'і, усіх дарослых.

Асаблівай увагі патрабуюць дзеці малодшага ўзросту. Выхаванец дзіцячага сада № 186 Саша Пазняк 31 жніўня прычапіўся за прыцэп грузавога аўтамабіля, які рухаўся па вуліцы Фролікава, і, не ўтрымаўшыся, сарваўся.

Таварышы бацькі, вызначце тэрыторыю для гульняў дзяцей і забараніце ім пакідаць яе межы.

З 1-га па 30-е верасня праходзіла ўсесаюзная аперацыя «Пешаход». Важнае месца ў ёй было адведзена папярэджанню дзіцячага транспартнага траўматызму.

У школах рабяты вывучаюць правілы дарожнага руху. Аднак тэарэтычныя веды неабходна замацаваць практычна на спецыяльных пляцоўках. У абсталяванні такіх пляцовак, аўтакласаў, правядзенні экскурсій па гораду і па аўтагаспадарцы могуць дапамагчы школе бацькі, работнікі аўтатранспарту, аўталюбіцелі.

Таварышы любіцелі аўтатранспарту! У апошні час сталі частымі выпадкі наездаў транспарту на дзяцей у дварах, мясцовых праездах і на пешаходных пераходах. Будзьце асабліва ўважлівымі пры руху ў жылых кварталах, у месцах магчымага паяўлення дзяцей. Звярніце ўвагу на выкананне патрабаванняў пункта 105 Правілаў дарожнага руху, у якім гаворыцца: «Пры павароце налева ці направа вадзіцель павінен прапусціць пешаходаў, якія пераходзяць праезджую частку дарогі па дазваляючаму сігналу светафора або рэгуліроўшчыка».

Н. КАПІТОНАВА,
супрацоўнік ДАІ
УУС Мінгарвыканкома.

Ужо больш 10 год студэнты геаграфічнага факультэта шэфствуюць над воінскай часцю. Яны бываюць частымі гасцямі ў сваіх падшэфных.

Вось і на гэты раз, напярэдадні 60-годдзя Кастрычніка, агітбрыгада факультэта выязджала да воінаў са святочнымі канцэртамі.

З задорнымі танцамі, лірычнымі вершамі, байкамі, песнямі замежных і савецкіх кампазітараў, пародыямі студэнты выступілі перад воінамі ў іх салдацкім клубе.

Асабліва цёпла сустрэлі гаспадары выступленні студэнтаў III курса Алены Куцепавай і Валянціны Быкавай, студэнтаў I курса Аляксандра Аксёненкі і Сяргея Барысевіча. Сустрэтыя бурнымі апладысментамі, двойчы выходзілі на сцэну гітарысты Аляксандр Фралоў і Уладзімір Кіслы. Вершы, якія прачытала студэнтка I курса Ала Кіклевіч, прымусілі салдат успомніць родны дом, сваіх маці, каханых.

Не пакінулі нікога ў зале абыякавымі танцы ў выкананні ўдзельнікаў танцавальнага калектыву. У заключэнне канцэрта перад воінамі выступіў вакальна-інструментальны ансамбль факультэта «Праменні» (кіраўнік Аляксандр Перцаў).

З КАНЦЭРТАМ — ДА ПАДШЭФНЫХ



Канцэрт закончыўся «Гімнам геафака», які спявалі ўсе ўдзельнікі агітбрыгады.

У Дзень Савецкай Арміі воіны будуць жаданымі гасцямі ў сваіх шэфаў — студэнтаў геафака.

Г. СУРАЎНЁЎ.

НА ЗДЫМКУ: выступленне вакальна-інструментальнага ансамбля геафака «Праменні».
Фота **С. Курдзіна.**

Навінка «Спортлато»

З кожным годам шырыцца спартыўнае будаўніцтва ў нашай краіне. Працуюць новыя палацы спорту і басейны, гарадскія і сельскія стадыёны, лыжныя базы і спортпляцоўкі.

Спартыўныя латарэі таксама знаходзяцца ў развіцці — яны набываюць усё новыя формы. Аматары гульні з захапленнем прынялі навінку — 7-льготны шар.

З мэтай далейшага пашырэння геаграфіі гульні з лістапада 1977 года мы знаёмімся яшчэ з адной навінкай — бестыражнымі карткамі «Спортлато-2» і «Суботняе спортлато». У чым жа іх асаблівасць? Яна заключаецца ў тым, што кожнаму ўдзельніку прадастаўляецца права самому прастаўляць ва ўсіх трох частках карткі нумар тыражу, у якім ён хацеў бы ўдзельнічаць.

Набываючы за 60 кап. бестыражную картку «Спортлато-2» ці «Суботняе спортлато», удзельнік гульні павінен закрэсліць у частках «Б» і «В» 6 нумароў (відаў спорту) карткі «Спортлато-2» і 5 нумароў карткі «Суботняе спортлато», а затым на ўсіх трох частках карткі пад указаннем года выпуску праставіць дакладна нумар любога прадстаячага тыражу, якія будуць разыгрывацца да 31 снежня 1977 года.

Калі ж вы забыліся напісаць на картцы нумар тыражу, не трэба адчайвацца. Ваша картка прыме ўдзел ў апошнім тыражы года.

Запоўніўшы бестыражную картку, вы аддзяляеце частку «А», якая з'яўляецца квітанцыяй на атрыманне выйгрышу, а часткі «Б» і «В» у нераздзеленым выглядзе загадзя апускаеце ў скрынку «Спортлато», але не пазней указанага на ім тэрміну для данага тыражу.

Бестыражныя карткі «Спортлато» вельмі зручныя для ўдзельнікаў, якія карыстаюцца пэўнымі камбінацыямі лічбаў, для ўсіх, хто не мае магчымасці па розных прычынах рэгулярна набываць карткі на кожны тыраж, і асабліва для жыхароў сельскай мясцовасці.

Аматары гульні ў сельскай мясцовасці, дзе няма скрынак «Спортлато», могуць не пазней, чым за 10 дней да тыражу, адправіць часткі «Б» і «В» у канверце па пошце па адрасу: 220002, г. Мінск, вул. Даумана, 13, Беларускае занальнае ўпраўленне «Спортлато».

Жадаем вам поспеху!

А. РАГАЛЬСКІ,
старшы інструктар Беларускага занальнага ўпраўлення «Спортлато».

ГУМАР ГУМАР ГУМАР

ПИОНЕРЫ

ЮМОРЕСКА

Уже третий день не работала фараоновская кухня: главный повар, отведав отравленное злоумышленниками блюдо, почил в бозе.

Хеопс шумно вздохнул и надорвал пакетик пастеризованного молока. Тяжкая дума о бренности мирского существования терзала его неразвитое, рабовладельческое сознание. Это хорошо еще, что повар перекинулся, а не попробуй он фрикаделек перед тем, как подавать на государев стол...

Вот загнешься, так никто о тебе и не вспомнит через тысячу-другую лет. А что, если...

Хеопс повертел в руках пакет и велел кликнуть своего первого советника.

— Послушай-ка, любезнейший, сколько времени понадобится, чтобы построить из камня такую штуку, — показал фараон на пакет, — но раз в тысячу больше?

Советник деликатно ухмыльнулся:

— Шутить изволите, фараон-батюшка. Даже через многие сотни лет, когда люди придумают подъемные краны и строительные управления, такое сооружение будет казаться им чудом.

Не терпел Хеопс, когда ему перечили. И объяснил советнику, что, если ровно через месяц пирамида не будет построена, его бросят в Нил, предварительно упаковав в полиэтиленовый мешок из-под фиников.

Тоска несусветная обуяла с тех пор советника. Фараонишка проклятый! Думает, что его глупое рабовладение — вершина прогресса. Как же, много настроишь при таких зверских производственных отношениях, когда чуть что — сразу в Нил головой.

А роковая дата приближалась. Неумолимо. Рабы, согнанные со всех концов державы, уныло выдалбливали в каменоломнях многотонные плиты, по бревнам волокли к месту строительства. Работы было лет на двести.

Чудо свершилось, как всегда, в последний день. К берегу лихо причалила диковинная посудина, из которой шумно вывалила ватага чернокудрых парней в странных зеленых одеждах с надписями на спинах «Юность-77 до нашей эры».

— Заморские мы, — объяснил ихний старшой опешившему советнику. — Выездной отряд, папаша. Чай, не слыхал-то?

Иноземец окинул оком удручающую панораму строительства: каменоломни, медленно ползущие по дороге плиты и желтую ящерицу, которая загорала на фундаменте будущей пирамиды.

— Да, придется повкалывать. Раньше, чем до утра, не справимся. Уж не обессудь, папаша.

— Касатики вы мои! — рухнул наземь советник, норовя лобызнуть стопу своего спасителя.

...Хеопс проснулся с радостным предчувствием развлечения. Правда, казнь — это немножко жестоко, но что же делать, если довелось родиться в такой варварский век, когда нет ни футбола, ни поп-музыки, даже боя быков, на худой конец. Прошлепав босиком к окну, он взглянул туда, где вчера начинали закладывать фундамент пирамиды и... дворцовый пол глухо крякнул от удара фараоновского затылка.

Назавтра, после погребальной церемонии, мумия была торжественно помещена в только что отгроханное сооружение.

А. КЛАСКОВСКИЙ.

ВЯСЁЛЫ АЛОВАК



Без слоў; перад скачком; акселерацыя.

Малюнкі **Н. Лугавой, В. Мартыненкі** і **Т. Канстанцінава.**



Ніл ГІЛЕВІЧ

ПЫТАННЕ Ў АДКАЗ

Бацька ўшчувае вучня-сына:
— Знаеш ад чаго ссівеў я так?
Што сварыўся на цябе
няспынна
за ляноту за тваю, лайдак!
Сын унурыўся, зірнуў
спадлоб'я
і спытаў, не ўзняўшы галавы:
— Калі гэта праз мяне —
дык добра;
адчаго тады мой дзед сівы?

ХАВАЙСЯ, ТАТА!

Убачыў аднойчы ў кіно Ігарок,
як фарбаю твары малююць
індзейцы,
і ў бацькі спытаўся (цікаўныя
дзеці!):
— Навошта яны сябе мажуць
знарок?
А бацька ў адказ: — Гэта
значыць, яны —
да бітвы рыхтуюцца, сын, да
вайны.
Назаўтра ж уранку,
падняўшыся шустра,
малышак да бацькі ўляцеў у
пакой:
— Хаваймася! Мама стаіць
перад люстрам —
рыхтуецца йсці на кагосьці
вайной!

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080, Мінск-80. Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14.
Тэлефон 22-07-19.

АТ 21124 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ № 1797.